# ПРАЦОЎНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЎЧЫНАК НА МАЗЫРСКІМ ПАЛЕССІ

**Сычова І.С.**
УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

МГПУ им. И.П. Шамякина

Працоўнае выхаванне дзяўчынкі, дзяўчыны, будучай жанчыны – састаўная частка народнай педагогікі Мазырскага Палесся, дзе яскрава праяўляюцца адметнасць светапогляду і спосабу жыцця беларусаў-палешукоў.

У агульных рысах дзяўчына (дзеўка) – гэта паслухмяная дачка сваіх бацькоў, а ў будучым – добрая жонка, памочніца мужа, таксама клапатлівая маці, умелая і старанная гаспадыня, якая корміць, абшывае, абмывае сям'ю, з'яўляецца захавальніцай сямейных традыцый. Найбольш яскрава народны ідэал дзяўчыны прадстаўлены ў комплексе перадвясельных і вясельных абрадаў: падрыхтоўка пасагу, абрады выпрабавання маладой, пажаданні пры дзяльбе каравая інш.

Змест працоўнага выхавання дзяўчыны вызначаўся побытам і асноўнымі працоўнымі заняткамі беларусаў-палешукоў: земляробства і жывёлагадоўля; вырошчванне садавіны і гародніны; збіральніцтва, нарыхтоўка грыбоў і ягад; народныя рамёствы і промыслы.

Даследчык Мазырскага Палесся І.Сербаў адзначаў выключную працавітасць мясцовых жыхароў: "*Сакуны поразительно трудолюбивы и выносливы. Кажется, им нет ни дня, ни ночи. Около третьих "пеўнеў" они уже на ногах и остаются на работе до позднего вечера, то в поле с волом, то на поплаве с косой, то в лесу с топором. Женщины в трудолюбии не уступают мужчинам. Если нет работы дома или в поле, они с лукошками за плечами шарят по зарослям, собирают грибы или ягоды*" [1, с. 38].

Дзяўчаты вучыліся вырошчваць і апрацоўваць лён, прасці кудзелю, ткаць і бяліць палотны, шыць адзенне, плесці карункі, вышываць, гатаваць традыцыйныя стравы, выхоўваць дзяцей згодна з правіламі народнага этыкету, падтрымліваць парадак у доме і інш. Тэхналагічна складаныя і працаёмкія жаночыя заняткі садзейнічалі развіццю такіх якасцей, як карпатлівасць, цярплівасць, спрыт, настойлівасць, акуратнасць, дакладнасць і інш.

Працоўнае выхаванне дзяўчат актуалізавалася народным мастацтвам, паколькі большасць працоўных заняткаў суправаджалася народнымі песнямі: сямейна-бытавымі, жніўнымі, палольнымі, ягаднымі, талочнымі і інш. У працэсе працы маладыя актыўна пераймалі працоўнае і песеннае майстэрства старэйшых жанчын. Рытм дапамагаў хутка набыць працоўныя ўменні і навыкі, а народная песня садзейнічала самавыражэнню.

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся сфарміравалася патрабаванне пачынаць працоўнае выхаванне яшчэ да нараджэння дзіцяці (пры выбары пары з працавітага роду, праз сістэму забарон для цяжарнай жанчыны). У свядомасці палешукоў любоў і здольнасць да працы выступае не толькі як набытая, але і як прыроджаная якасць, перадаваемая генетычна: *"Есіп Карнееў, бо мае жонку працавітую, як мурашачка, сам працавіты, як вол, дак можна спадзявацца, што і дзеці, калі падрастуць, то будуць працавітыя і будзе спор у працы"* [2, с. 560].

Прад'яўляліся патрабаванні да здароўя маладой, што забяспечвала працаздольнасць: *"Дзеўка пойдзе на рэчку плацце праць. Жаніх ходзіць, выглядае, як*

*прыйдзе з рэчкі і палезе на печ, то не бярэ, к другой пойдзе”* [3, с. 325]. Працэс прання бялізны з’яўляўся сапраўдным фізічным выпрабаваннем для дзяўчыны. Бялізну залівалі гарачай вадой з попелам і замочвалі ў жлукце, а затым выпалосквалі на рэчцы ці ў любым бліжэйшым вадаёме, білі пранікам, выкручвалі з дапамогай спецыяльнага калка, убітага на беразе. Асаблівай фізічнай загартоўкі гэта патрабавала зімой, у люты мароз, калі менавіта і стараліся памыць бялізну, каб яна добра вымерзла [2, с. 361-362]. Так у дастаткова суровых прыродных умовах рэгёна ставілася і даступнымі сродкамі вырашалася задача загартоўкі моладзі, а ў будучым – нараджэння здаровага патомства.

З першых хвілін жыцця адбывалася вызначэнне будучых працоўных заняткаў адпаведна полу дзіцяці. Для дзяўчынак пры перарэзванні пупавіны спрыяльнымі былі рэчы, якія адпавядалі жаночым заняткам: *“А дзевацці пупавіну баба атрэзвае, палажыўшы на прасніцу або на чоўнік, каб яна, як вырасце, была ахвотніца да жаночае работы”* [4, с. 174].

Падросшы, дзяўчынкі выпякалі з пяску бліны, спрабавалі прасці, ткаць, шыць адзенне. Падобныя імітацыйныя гульні дазвалялі засвоіць этапы працоўных працэсаў, фарміравалі светапогляд, выпрацоўвалі характэрную сістэму каардынацыі рухаў.

Асаблівую ўвагу беларусы-палешукі звярталі на першы працоўны вопыт, прыпісваючы яму незвычайныя ўласцівасці. Як правіла, першую спрадзеную кудзелю спальвалі, каб работа гарэла ў руках.

Працоўнае выхаванне дзяўчынак мела мэтанакіраваны характар, іх цікаўнасць да жаночай працы свядома заахвочвалася. Па сведчаннях апытаных жыхароў Мазыршчыны, дзяўчынак вадзілі на вячоркі, каб вучыліся прасці, вышываць.

Практычны характар працоўнай дзейнасці прадугледжваў актыўнасць выхаванцаў, адсутнасць дробязнай апекі. У 5–6 гадоў дзеці атрымлівалі пасільныя працоўныя даручэнні: няньчылі малодшых братоў і сясцёр, дапамагалі мыць посуд, прыбіраць у хаце. Удзельнічалі ў праполцы разам з дарослымі, як толькі маглі адрозніць пустазелле ад культурных раслін. Даглядалі і пасвілі хатніх птушак і жывёлу: гусей, качак, свіней, авечак, кароў і інш. Улетку хадзілі ў лес па ягады: суніцы, чарніцы, ажыны, брушніцы, журавіны.

Эфектыўнасці працоўнага выхавання садзейнічалі народныя традыцыі. Імператыўна патрабавалася ў пэўныя дні тыдня ці года (у суботу, да Каляд, да Вялікадня ў чысты чацвер, да вяселля) прыбраць у хаце: пабяліць столь, сцены, печ з комінам; памыць дзверы з вушакамі, касякі, падваконнікі, рамы, шыбкі; пашараваць мэблю: стол, лаву, зэдлік, калоду, падстаўку пад хлебную дзяжу, паліцы; вывесіць чыстыя ручнікі, замяніць настольнікі, перасланць пасцелі [2, с. 361]. Дзяўчаты-падлеткі, звычайна дапамагалі маці, што забяспечвала пераемнасць у выхаванні.

З 15–16 гадоў дзяўчаты працавалі нароўні з дарослымі, каб да дасягнення паўналецця навучыцца выконваць усе віды жаночых работ. Працавітасць і працоўныя ўменні садзейнічалі набыццю аўтарытэту, сацыяльнай сталасці дзяўчыны. Лічылася, што, чым больш у яе было выткана і вышыта посцілак, настольнікаў, сарочак, ручнікоў, тым больш яна мела пасаг, а значыць, была больш умелай, працавітай і хутчэй выходзіла замуж.

На Мазырскім Палессі вялікае значэнне надавалася адпаведнасці працоўнай дзейнасці ўзросту і полу дзіцяці: *“Гоп-чук-чук-чук... /Лепей дзеўка, як дзяцюк. /Дзяцюк дроў насячэ —/Дзеўка блінцоў напячэ. /Дзяцюк сядзе паядае — /Дзеўка пойдзе пагуляе”* [5, с. 498]. Існавалі строгія забароны на выкананне мужчынскіх і жаночых работ прадстаўнікамі супрацьлеглага полу. Іх парушэнне магло прывесці да непажаданых наступстваў: з’яўленню фізічных (грудзі ў мужчын, барада ў жанчын) або псіхічных прыкмет (страх, трывога, баязлівасць, нерашучасць у мужчын; змена голасу і паводзін у жанчын), уласцівых супрацьлегламу полу. Дзяцей і падлеткаў, якія паводзілі сябе

МГПУ им. И.П.Шамякина

неадпаведна дадзенаму прыродай полу, называлі *“хлапчур”* або *“хлапчурка”* – дзяўчынка, якая любіць хлапечыя забавы; адпаведна *“дзяўчур”* і *“дзяўчурка”* – хлопчык, які паводзіць сябе як дзяўчынка. Так праз побыт і працоўную дзейнасць з пакалення ў пакаленне перадаваліся архетыповыя мадэлі мужчынскіх і жаночых паводзін.

У традыцыйнай палескай сям’і жылі разам, як правіла, тры пакаленні, што садзейнічала перадачы працоўнага вопыту праз пакаленне. Метадам пераймання дзяўчынка вучылася ад маці ці бабулі прасці, ткаць, плесці карункі. Ад старэйшых жанчын перадаваліся не толькі прадметы побыту, але і песні, замовы, казкі, мясцовыя кулінарныя рэцэпты, прыёмы ткацтва, узоры на ручніках. Адзінства вялікіх палескіх родаў падтрымлівалася народнымі звычаямі: сумесная праца (дажынкі, дакопкі), гасцяванне, бяседа, адзначэнне радзін, хрысцін, вяселляў.

У цэлым на Мазырскім Палессі назіраецца больш трывалая сувязь дзіцяці з родам маці, чым з бацькоўскім родам. Брату маладой адводзіцца значная роля на мясцовым вяселлі, выяўляюцца рэшткі абраду *“дзядзькаванне”,* выхаванне ў сям’і дзядзькі, брата маці. Тэндэнцыя ўзмацнілася ў пасляваенны час, калі мужчыны не вярнуліся з вайны; назіраецца яна і зараз, калі маладыя людзі пазбягаюць несці адказнасць за выхаванне дзяцей.

З развіццём прамысловасці, зменай форм уласнасці на зямлю і заняпадам шэрагу традыцыйных для палешукоў рамёслаў і промыслаў значна змяніўся змест працоўнага выхавання моладзі абодвух палоў. Тым не менш вопыт народнай педагогікі актуальны і ў нашы дні, паколькі знаходзіць водгук у менталітэце, сямейных традыцыях, мае масавы і ўніверсальны характар.

**Літаратура**


1. Сербовъ, И.А. Белорусы-сакуны: краткий этнографический очеркъ / И.А. Сербов. – Петроградъ: типография императорской академии наукъ, 1915. – 180 с.
2. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч; уклад. У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2004. – 672 с.
3. Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад. В.С. Новак [і інш.]. – Гомель: ЛМФ “Неман”, 2003. – 472 с.
4. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
5. Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры: Гомельская вобласць / уклад. В.А. Захарава [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1989. – 384 с.


МГПУ им. И.П. Шамякина